УДК 947.6

**А.В. ЕФІМОВІЧ**

# ХВАЛЯВАННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ СЯЛЯН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У КАНЦЫ 50-х – ПАЧАТКУ 60-х гг. XIX ст.

Пад час правядзення рэформы М.М. Мураўёва ў дзяржаўнай вёсцы Беларусі ў 1857 – 1862 гг. значна пагоршылася становішча сялян гэтых маёнткаў: павялічыліся аброчныя падаткі, скараціліся зямельныя надзелы, павялічыўся ўціск на дзяржаўных сялян з боку арандатараў. Зразумела, што ўзмацненне эксплуатацыі не магло не выклікаць рэакцыі сялян.

Пры вывучэнні гісторыі Расіі і Беларусі, пачынаючы з другой паловы 50-х гг. XIX ст., можна заўважыць, што павялічваецца колькасць выпадкаў хваляванняў сялян. Супраціўленне сялян праяўлялася ў самых розных формах. Найбольш тыповымі і найбольш распаўсюджанымі формамі і метадамі барацьбы дзяржаўных сялян можна лічыць: адказ ад выканання павіннасцей; непрызнанне арандатарскай улады; падача прашэнняў і скарг на імя губернскіх і цэнтральных органаў улады і інш. [8, с. 150].

Вельмі часта падчас хваляванняў прыходзілася ўводзіць войскі. Па дадзеных ІП аддзялення Міністэрства ўнутраных спраў, сялянскія хваляванні, якія ўдалося падавіць толькі з дапамогай войск, пачашчаліся з года ў год: у 1860 г. такіх хваляванняў было болей, чым у 1858 г., прыкладна на 25% [10, с. 189].

Сялянскія хваляванні насілі часцей за ўсё стыхійны і неарганізаваны характар. Прычыны іх былі розныя. Так, у гэты час Міністэрства дзяржаўных маёмасцей

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

праводзіла рэформу. Аднак праведзеная рэформа не здолела палепшыць становішча дзяржаўных сялян. Згаданая рэформа праводзілася толькі ў дзевяці Заходніх губернях, што паўплывала і на сялянскі рух. Сяляне гэтага рэгіёна апынуліся ў больш дрэнным становішчы, чым дзяржаўныя сяляне ўсходніх губерняў Расіі. Менавіта таму іх рух аказаўся адасобленым ад агульнарасійскага.

Патрэбна ў гэтай сувязі заўважыць і тое, што ў губернях, якія знаходзіліся бліжэй да вялікарасійскіх (Магілёўская, Мінская і Віцебская), па дадзеных, якія характарызуюць рэформу, бачна, што ўціск з боку дзяржавы і яе прадстаўнікоў быў меншы, чым у Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай. Гэта звязана з дзвюма прычынамі: у губернях, дзе былі меншыя плошчы пад казённым кіраваннем і дзе дзяржаўных сялян было меней, рэформа прайшла больш спакойна. У губернях, якія знаходзіліся бліжэй да Захаду, дзяржаўных сялян было больш, таму і рэформа тут праходзіла больш складана. Гэта ж адбівалася і на хваляваннях дзяржаўных сялян.

Матэрыялы сялянскіх хваляванняў перыяду другой паловы 50-х – пачатку 60-х гг. XIX ст. пацвярджаюць, што з восені 1861 г. колькасць сялянскіх хваляванняў пайшла на спад. Гэта звязана з тым, што ў гэты час рэформа М.М. Мураўёва згортвалася.

У гэты перыяд Міністэрства дзяржаўных маёмасцей баялася толькі таго, што дзяржаўныя сяляне пачнуць патрабаваць прымянення і да іх Палажэння 19 лютага 1861 г. Аднак на месцах былі праведзены меры, каб не дапусціць такога развіцця падзей.

Але новая хваля барацьбы ўзнялася падчас паўстання 1863 г. ў Польшчы, Літве і Беларусі.

Паўстанне нечакана пачалося 22 студзеня 1863 г. Падрыхтоўка да паўстання яшчэ не была завершана, калі ў канцы 1862 г. стала вядома пра намер царскага ўрада правесці рэкруцкі набор. На службу павінны былі пайсці тыя, на каго разлічвалі ў паўстанні. Літоўскі Правінцыяльны Камітэт (ЛПК) вырашыў падтрымаць паўстанне толькі 1 лютага 1863 г.

Цэнтральны Нацыянальны Камітэт (ЦНК)ператварыўся ў Польскі нацыянальны ўрад, а ЛПК абвясціў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі. У Маніфесце Польскага нацыянальнага ўрада патрабаванні рэвалюцыйных дэмакратаў па аграрным пытанні не былі ўключаны. Сялянам аддавалася толькі тая зямля, якую яны ўжо атрымалі ў арэнду падчас рэформ. Гэтую ж праграму вымушаны быў падтрымаць і Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі, які ў § 2 свайго Маніфеста ад 1 лютага 1863 г. напісаў наступнае:

«Нацыянальны Польскі ўрад аддае панскім і скарбовым (дзяржаўным) сялянам на вечныя часы ў поўнае ўладанне без чыншаў і выкупаў тую зямлю, якую яны мелі да гэтага часу...» [9, с. 118].

У пачатку сакавіка да паўстання далучыліся «белыя», бо баяліся, што паўстанне перарасце ў народную рэвалюцыю. Гэта пазней стала адной з галоўных прычын падаўлення паўстання. Усе вышэй пералічаныя факты абумовілі тое, што да паўстання далучылася вельмі мала сялян. Яны не маглі зразумець мэты паўстання і не маглі змагацца разам са сваімі прыгнятальнікамі за інтарэсы апошніх. Але гэта менш датычылася дзяржаўных сялян, якіх прыгняталі арандатары (гэта былі прадстаўнікі розных сацыяльных груп, і не заўсёды шляхта). Напэўна таму сярод сялян-паўстанцаў большасць былі дзяржаўнымі.

Аднак асноўнай прычынай таго, што сяляне прынялі ўдзел у паўстанні, была незадаволенасць аграрнымі рэформамі М.М. Мураўёва ў дзяржаўнай вёсцы і 1861 г. – у памешчыцкай. У выніку гэтых рэформ становішча ні прыватнаўласніцкіх, ні дзяржаўных сялян не палепшылася, а ў некаторых выпадках нават пагоршылася. Незадаволенасць гэтага класа была значная, таму прыцягнуць яго да паўстання было

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

магчыма. Самыя радыкальныя кіраўнікі паўстанцкіх атрадаў, такія як К.С. Каліноўскі, на гэта і спадзяваліся, імкнуліся прыцягнуць да ўдзелу ў паўстанні як мага больш сялян. Левыя «чырвоныя» ў ЛПК нават планавалі распаўсюдзіць паўстанне на прыбалтыйскія і расійскія губерні. Аднак планы рэвалюцыянераў не ажыццявіліся. Сярод паўстанцаў сялян было няшмат, асабліва ва ўсходніх губернях Беларусі: у Віцебскай – 7%, Магілёўскай – 13%, Мінскай – 20%. Толькі ў Віленскай і Гродзенскай губернях сяляне складалі больш за чвэрць паўстанцаў – адпаведна 27 і 33%. Увогуле колькасць паўстанцаў, непасрэдна прымаўшых удзел ва ўзброеных дзеяннях, не паддаецца дакладнаму вызначэнню [6, с. 345].

Супадзенне сялянскага руху супраць рэформ у адносінах часу і месца з пачаткам паўстання на тэрыторыі Беларусі дало некаторым даследчыкам магчымасць сцвярджаць, што паўстанне насіла сялянскі характар. Зразумела, няправільна зусім адмаўляць уплыў паўстання на ўзвышэнне актыўнасці сялянскай барацьбы супраць рабаўніцкіх рэформ. Аднак патрэбна памятаць, што іх рух нідзе не выліўся ў паўстанне.

Але, адмаўляючы сялянскі характар паўстання 1863 г., мы далёкія ад думкі адмаўляць усялякі ўдзел сялян у ім. Адносіны сялян Беларусі да паўстання былі розныя. У гэтым адыграла сваю ролю наяўнасць сярод іх дзвюх розных па свайму становішчу груп – дзяржаўных і памешчыцкіх сялян.

Сярод сялян найбольшы ўдзел у паўстанні прынялі дзяржаўныя. Яны непасрэдна не адчувалі на сабе памешчыцкі гнёт, для іх ненавісным феадалам была казна. Рэформа П.Дз. Кісялёва павялічыла павіннасці дзяржаўных сялян, але не вырашыла зямельнае пытанне. Аграрная рэформа М.М. Мураўёва асабліва цяжка адбілася на сялянах заходніх губерняў. Зноў пачалі здавацца ў арэнду прыватным уладальнікам фальваркі, на 64% былі павышаны аброкі, але сялянскія надзелы пры гэтым паменшыліся. Дзяржаўныя сяляне ўвесь час адчувалі на сабе самаўпраўства царскіх улад. Сам М.М. Мураўёў, заступіўшы на пасаду Міністра і пазнаёміўшыся на месцах са становішчам дзяржаўных маёмасцей, вымушаны быў прызнаць, што «кіраванне дзяржаўнымі маёмасцямі ў губернях – гэта збор людзей, якія пастаўлены тут, каб абіраць сялян з усіх бакоў і за ўсё». Таму асноўны лозунг паўстання –звяржэнне царскага самадзяржаўя (у рэвалюцыйных дэмакратаў) – мог знайсці сярод дзяржаўных сялян шырокі водгук. Удзел дзяржаўных сялян у паўстанцкіх атрадах і іх спачуванне паўстанню азначаў М.М. Мураўёў, міравы пасрэднік Ваўкавыскага павета Львоў і многія іншыя. Гэта ж пацвярджае ў сваіх паказаннях і К.С. Каліноўскі. Ён пісаў, што ў Гродзенскай губерні паўстанцкія атрады складаліся «большай часткай з сялян казённых, дробнапамеснай шляхты і гарадскіх жыхароў» [1, с. 431].

Аб пераважным удзеле ў паўстанні дзяржаўных сялян сведчыць і данясенне міністру дзяржаўных маёмасцей В.А. Белічаву 25 красавіка 1863 г. аб далучэнні да паўстанцаў маладых дзяржаўных сялян Андронішскага і Анікштынскага сельскага грамадства Вількамірскага павета Ковенскай губерні: «Памочнік панявежскага акруговага кіраўніка Шпакоўскі данёс, што з'явіўшыеся ў лясах Андронішскага сельскага грамадства шматлікія шайкі мяцежнікаў сталі вельмі моцна ўздзейнічаць на думкі маладых сялян і з іх ліку да 150 чалавек, якіх уцягнулі абяцаннямі і пагрозамі, далучыліся да той шайкі[1]. У Анікштынскім жа грамадстве з'явіліся таксама значныя шайкі, добра ўзброеныя, якія, заняўшы маёнтак Анікшты, знішчылі, па-перш, тутэйшае сельскае кіраўніцтва, а таксама станавога пристава, усе паперы і справы».

[1] З дакументаў бачна, што з 1 сакавіка па 24 красавіка 1863 г. больш за 600 маладых дзяржаўных сялян з 11 сельскіх грамадстваў пайшлі ў атрады паўстанцаў.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Далей у дакуменце гаварылася, што далучэнне сялян да мяцежнікаў адбываецца, з аднаго боку, ад страху смерці, якой са зброяй у руках пагражаюць мяцежнікі, а з другога – ад абяцанняў аддаць сялянам бязвыплатна зямлю і вызваліць іх ад усялякага роду падаткаў [5, с. 287-288].

Яшчэ адным доказам пераважнага ўдзелу ў паўстанні дзяржаўных сялян служаць следчыя справы над памешчыцкімі сялянамі. Так, у адной такой справе гаворыцца, што памешчыцкі селянін Корань у дзень Узнясення Гасподня ішоў у суседняе мястэчка, сустрэў шайку мяцежнікаў. Яны захапілі яго і не адпусцілі. У хуткім часе, калі яны сустрэліся з рускімі войскамі, ён збег ад мяцежнікаў і пайшоў да рускіх войск прасіць памілавання. Гэты факт гаворыць аб тым, што памешчыцкія сяляне не імкнуліся ў большасці прымаць удзел у паўстанні [7, л. 2].

Там, дзе кіраўнікі паўстанцаў паслядоўна вялі справу да развіцця аграрнай рэвалюцыі, у атрады ішлі не толькі дзяржаўныя, але і памешчыцкія сяляне. У Гродзенскай губерні сярод паўстанцаў была значная колькасць сялян, у Мінскай губерні ўдзел сялян у паўстанні быў значна меншы. Найбольшая частка сялян – удзельнікаў паўстання ў Мінскай губерні – прыходзілася на заходнія, памежныя з Гродзенскай губерняй, паветы (асабліва Навагрудскі).

Паўстанне ў Літве і Беларусі у значнай меры абапіралася на масавы стыхійны сялянскі рух супраць рабаўніцкай рэформы ў памешчыцкай вёсцы і самаўпраўства адміністрацыі ў дзяржаўнай вёсцы [3, с. IX-X].

Калі меркаваць па матэрыялах суседняй Літвы, то можна зрабіць вывад, што асноўнымі групамі сярод сялян-паўстанцаў былі дзяржаўныя сяляне, кутнікі, бабылі, халупнікі, агароднікі, іспольшчыкі. Трэба заўважыць, што ў пералічаных катэгорый сялян былі меншыя «класавыя разлікі» са шляхтай, якая складала значную групу сярод паўстанцаў, чым у сялян часоваабавязаных, якраз пераджыўшых разгар барацьбы з памешчыкамі за памеры сваіх сялянскіх зямельных надзелаў.

Аднак патрэбна заўважыць, што больш значны працэнт дзяржаўных сялян, якія ўдзельнічалі ў паўстанні, тлумачыцца не толькі асаблівасцямі іх сацыяльнага і эканамічнага становішча, але і колькаснай перавагай дадзенай групы сялян у асобных раёнах.

Мара К.С. Каліноўскага аб сялянскай рэвалюцыі не здзейснілася. Паўстанне 1863 г. не набыло сялянскага характару. Сярод паўстанцаў налічвалася толькі 20% сялян супраць 75% шляхты [2, с. 132-133].

Палітычная добранадзейнасць арандатараў, прадстаўнікоў розных саслоўяў, якая цалкам высветлілася ў 1863 г., не толькі мела згубны ўплыў на навакольных сялян, але вымусіла нават міністэрства адабраць ў іх фермы [4, с. 142].

Пры ўсёй стойкасці і ўпартасці сялянскі рух быў і заставаўся стыхійным, разрозненым і неарганізаваным. Ён насіў пераважна пасіўны, абарaняльны, а не актыўны, наступальны характар, што з'явілася асноўнай прычынай яго хуткага спаду.

Паўстанне было падаўлена, аднак у 1864 г. была праведзена яшчэ адна рэформа дзяржаўнай вёскі, якая стала вынікам паўстання 1863 г. Але аграрнае пытанне засталося нявырашаным. Паўстанне не перарасло ў рэвалюцыю: рух народных мае быў вельмі слабым. Але яно адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы далейшай барацьбы. Царскі ўрад вымушаны быў павярнуць на шлях радыкальных пераўтварэнняў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Байкова С.М.*** К вопросу об участии крестьян Белоруссии в восстании 1863 г. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1861 г. – Рига, 1963.
2. ***Бикулич В.Б.*** К вопросу об участии литовских крестьян в восстании 1863 – 1864 гг. // Революционная ситуация в России в 1859 – 1861 гг. – М., 1963.
3. Восстание в Литве и Белоруссии 1863 – 1864 гг. – М., 1965.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

4. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности министерства государственных имуществ 1837 – 1887. – СПб., 1888. – Ч. 2.
5. Крестьянское движение в России в XIX – начале XX в. – М., 1964. – Т. 2.
6. Нарысы гісторыі Беларусі. – Мн., 1994. – Ч. 1.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску. Фонд 295. Вопіс 1. Справа 1594.
8. ***Полонский А.В.*** К вопросу о некоторых формах борьбы крестьян периода разложения и кризиса крепостничества (на материалах Белоруссии) // Проблемы социально-экономического развития Белоруссии. – М., 1976.
9. ***Ратч В.*** Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-западной России. – Вильна, 1867.
10. ***Троицкий Н.А.*** Россия в XIX веке. – М., 1997.

## SUMMARY

*The peasants' revolts of the late 1850's – 1860's are considered in the article, the discontent of the state peasants with M. Muraviyov's Reform of 1857 – 1862 being emphasized by the author. The reasons for the state peasants' taking part in the uprising are given.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова